# Урок 1

## Беларуская літаратура перыяду 1966 — пачатку 1990-х гадоў

**Мэта ўрока:** пазнаёміць вучняў з агульнай характарыстыкай грамадска-культурнага і літаратурнага жыцця Беларусі ў 1966 — пачатку 1990-х гадоў, акрэсліць тэматычную і жанрава-стылёвую разнастайнасць айчыннай літаратуры акрэсленага перыяду; развіваць уменні вучняў вылучаць галоўнае ў лекцыі настаўніка, навыкі сціслага канспектавання; удасканальваць навыкі працы з вучэбным дапаможнікам; выхоўваць пачуцці грамадзянскага абавязку, любові і павагі да айчыннага слоўнага мастацтва.

**Абсталяванне:** партрэты мастакоў слова і выстава кніг твораў, якія будуць вывучацца на працягу года; папяровыя жамчужыны (для рэфлексіі).

**Эпіграфы:** Творца кнігі — аўтар, творца яе лёсу — грамадства...

*Віктар Гюго*

Ці не задача пісьменніка — фарміраванне, адбор лепшага?..

*Якуб Колас*

## ХОД УРОКА

### 1. Арганізацыйны момант

**1.1.** Стварэнне псіхалагічнага настрою.

— Уважліва паглядзіце на дошку, удумліва прачытайце выказванні старажытнарымскіх мудрацоў:

а) «Нішто не ўзнікае з нічога» (*Лукрэцый*);

б) «Самой прыродай так заведзена» (*Лівій*);

в) «Прыемна ўсведамленне закончанай працы» (*Цыцэрон*).

— Паспрабуйце растлумачыць афарызмы. (*Адказы вучняў.*) Які з іх кожны з вас возьме з сабой на ўрок? (*Адказы вучняў.*) Чаму? (*Адказы вучняў.*)

**1.2.** Знаёмства з вучэбным дапаможнікам па беларускай літаратуры для 11 класа, выставай мастацкіх твораў, якія будуць вывучацца на працягу года, асаблівасцямі выкладання прадмета, нормамі ацэнкі ведаў вучняў па беларускай літаратуры.

**1.3.** Афармленне сшыткаў (рабочых і кантрольных), знаёмства з патрабаваннямі іх вядзення.



### 2. Зварот да эпіграфа

— Зачытайце, калі ласка, словы Віктара Гюго і Якуба Коласа. Як вы іх разумееце? Якія адносіны маюць выказванні да айчыннай літаратуры? (*Адказы вучняў.*)

### 3. Мэтавызначэнне

### 4. Вывучэнне новага матэрыялу

**4.1.** Лекцыя настаўніка.

Заданне. Занатуйце тэзісы лекцыі настаўніка.

Трэці перыяд развіцця айчыннай літаратуры вылучаецца двума этапамі: а) 1956—1964 гг.; б) 1965—1985 гг. У апошні — кіраўніцтва Савецкага Саюза настойліва імкнулася «замарозіць адлігу», але інерцыю дэмакратызацыі літаратуры спыніць ужо было нельга.

У 1960-я гады ў літаратуру прыйшлі дзясяткі таленавітых маладых людзей, пакаленне так званых шасцідзясятнікаў, якія смела з гуманістычных пазіцый пачалі выяўляць думкі і перажыванні сучаснікаў, звяртацца да нядаўняй і далёкай мінуўшчыны роднага краю. Менавіта тады яскрава заявілі пра сябе, а пасля і сцвердзіліся як выдатныя майстры мастацкага слова Вячаслаў Адамчык, Рыгор Барадулін, Данута Бічэль, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч, Уладзімір Дамашэвіч, Васіль Зуёнак, Віктар Карамазаў, Уладзімір Караткевіч, Анатоль Кудравец, Алег Лойка, Еўдакія Лось, Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка, Янка Сіпакоў, Міхась Стральцоў і інш.

У 1966—1985 гады з найбольшай паўнатой раскрыўся талент і пісьменнікаў-франтавікоў — Міколы Аўрамчыка, Петруся Броўкі, Янкі Брыля, Васіля Быкава, Анатоля Вялюгіна, Аркадзя Куляшова, Максіма Лужаніна, Андрэя Макаёнка, Івана Мележа, Івана Навуменкі, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Аляксея Пысіна, Аляксея Русецкага, Івана Шамякіна і іншых, пра што сведчаць і прысуджаныя многім з іх высокія літаратурныя прэміі, у тым ліку Ленінская.

На вялікі жаль, у гэты перыяд (ці крышку пазней) пайшлі з жыцця выдатныя пісьменнікі як старэйшага пакалення, так і маладзейшага. Сярод іх — Пятро Глебка (1905—1968), Іван Мележ (1921—1976), Еўдакія Лось (1929—1977), Аркадзь Куляшоў (1914—1978), Пятрусь Броўка (1905—1980), Аляксей Пысін (1920—1981), Андрэй Макаёнак (1920—1982), Ларыса Геніюш (1910—1983), Міхась Стральцоў (1937—1987), Яўгенія Янішчыц (1948—1988), Уладзімір